


***Паспыта́ць*** — пакаштаваць, паспрабаваць на смак.
***Даќор*** — папрок за што-небудзь.



**ІВАН АНОШКІН**

## Воля-кулінарка

У Волі сёння свята: ёй споўнілася дзевяць гадоў. Дзяўчынка чакала гасцей.

Пачастунак сябрам Волька збіралася прыгатаваць сама. Распытала ў бабулі, як спячы пірог, і ўзялася за работу. Яна рашчыніла цеста, усыпала цукру, ванілі, усялякіх спецый з бабульчыных бляшанак.

— Не забудзь, унучка, соды ўсыпаць, — падказала бабуля.

— А дзе яна, сода?

— Ды вунь, — занятая сваёй справай, кіўнула бабуля на шафу.

Волька спрытна ўзабралася на табурэтку, знайшла на шафе соду, шчодра сыпанула ў цеста.

Госці завіталі вясёлай гурбой, уручылі падарункі: хто кніжку з малюнкамі, хто каляровыя алоўкі, хто шаўковыя стужкі. Волька шчыра падзякавала сябрам за падарункі, пачала гасцей



Правообладатель Национальный институт образования

за стол запрашаць. Кубкі з чаем прынесла, пірог падала: частуйцеся, калі ласка!

— Сама пякла, — пахвалілася Волька, разразаючы нажом румяную скарынку пірага.

— Паспытаем, — Пятрусь першы адкусіў пірог. Адкусіў і чамусьці скрывіўся.

Нож выпаў з Вольчыных рук. «Чаму не падабаецца гэтаму Петрусю?» Узяла яна кавалачак пірага ў рот і… таксама зморшчылася. А бабуля, паспытаўшы, з дакорам паківала галавой.

— Колькі ж ты соды ўсыпала?

— Усю, што ў бляшанцы была, — праз слёзы адказала Волька. — Каб пірог быў смачнейшы…

— Эх ты, кулінарка! — пляснула далонямі бабуля. — Хапіла б чайнай лыжачкі…





Правообладатель Национальный институт образования

Яно, можа, і нядобра смяяцца з імяніннiцы, але як тут утрымаешся. І госці смяяліся. А Волька, здавалася, вось-вось заплача.

— І не такое бывае, — суцяшала яе бабуля. — Горш, калі хто ні за што не бярэцца... Я вас, унучкі, сваім пячэннем пачастую...

Хлопчыкі і дзяўчынкі пілі чай з бабульчыным пячэннем, пасмейваліся. Але Волька больш не крыўдзілася на іх.

*Паводле І. Аношкіна.*

1. Якое свята адзначала Волька?
2. Чым вырашыла здзівіць дзяўчынка гасцей? Як гэта яе характарызуе?
3. Які недарэчны выпадак адбыўся за сталом падчас святкавання? Прачытайце.
4. Ці правільна паводзілі сябе госці? Раскажыце, як вы павялі б сябе ў падобнай сітуацыі.
5. Як бабуля суцешыла ўнучку? Прачытайце.
6. Як вы разумееце словы бабулі: «Горш, калі хто ні за што не бярэцца...»?
7. Чаму Волька больш не крыўдзілася на сяброў?
8. Разгледзьце ілюстрацыю на с. 71. Перакажыце ўрывак з апавядання, да якога яна адносіцца.

**Давайце абмяркуем.** Раскажыце, якія прафесіі ў вашых бацькоў, бабуль і дзядуль. Кім вы хацелі б стаць?



Правообладатель Национальный институт образования

## ПРАВЕРЦЕ СЯБЕ

***Ведаю...***

1. Пра якую прафесію апавядае пісьменнік? У якім творы?

а) «— Гэта, сынок, гаспадар, — растлумачыла маці. — Ты ж дапамагаеш нам і бычкоў пасвіць, і сена валкаваць, і ваду ў карыты з кранаў пускаеш...»;

б) «— Добра, — падтрымаў сыночка тата, — наша прафесія — самая патрэбная на зямлі. Мая брыгада пачала будаваць новы магазін. Ты хацеў бы нам дапамагчы?

— Яшчэ як хацеў бы, — узрадаваўся Паўлік»;

в) З Вольгай Паўлаўнай цікава.
Не злуецца, не крычыць.
Мы, як быццам для забавы,
Разам вучымся лічыць;

г) «Волька спрытна ўзабралася на табурэтку, знайшла на шафе соду, шчодра сыпанула ў цеста»;

д) Трэба жыта падкарміць,
Поле хораша ўзараць,
Да сяўбы падрыхтаваць.
А яшчэ павінен ён
Ведаць, дзе пасеяць лён,
Кукурузу і ячмень...



Правообладатель Национальный институт образования

2. Назавіце творы, да якіх зроблены гэтыя малюнкі.









3. Устанавіце адпаведнасць паміж назвамі твораў і іх героямі.

| Героі | Твор |
|---|---|
| А) Бабуля, Волька, яе сябры; | 1) «Паўлік-будаўнік»; |
| Б) бацька, Рома; | 2) «Маленькі фермер»; |
| В) Сяргей, Максімка, бацька, маці; | 3) «Тата ў Ромы — аграном»; |
| Г) Паўлік, тата | 4) «Воля-кулінарка» |



Правообладатель Национальный институт образования

***Разумею, магу растлумачыць...***

1. Чым аб'яднаны ўсе вершы і апавяданні гэтага раздзела? Вызначце іх агульную тэму і асноўную думку.

2. Назавіце творы, якія вам найбольш спадабаліся і запомніліся.

3. Якія мудрыя ўрокі вы атрымалі дзякуючы вывучаным творам?

4. Як вы думаеце, чаму пытанне выбару прафесіі ў жыцці чалавека застаецца адным з самых галоўных?

5. Суаднясіце прозвішчы аўтараў і назвы іх твораў:

| | |
|---|---|
| *І. Муравейка* | «Маленькі фермер» |
| *І. Аношкін* | «Паўлік-будаўнік» |
| *М. Даніленка* | «Буду настаўнікам» |
| *Эдзі Агняцвет* | «Воля-кулінарка» |

6. Складзіце прыказкі. Растлумачце іх сэнс.

няма | хлеба | Без працы | чаго | шукаці.

без працы, | без крылаў. | што | птушка | Чалавек

а | густа, | дзе | лянота — | там | Дзе | шчырая | там | праца — | пуста.



Правообладатель Национальный институт образования

7. Адгадайце загадкі.



Уключыў як след прылады
Ды націснуў на педаль —
І пайшоў, пайшоў удаль!
За разораю разору
Вёў плугамі я ў прасторы.
І рабілася за мною
Поле мяккаю раллёю...
*Кастусь Цвірка.*

Кожны купіць, хто не лысы,
Кубак, конаўку ці місу.
Нарасхват ідзе тавар.
А зрабіў яго ... .
*У. Паўлаў.*

... з цэглы дом кладзе.
Сценка ў сценку роўныя.
Вы не знойдзеце нідзе
Працы больш шаноўнае.
*А. Астрэйка.*







Правообладатель Национальный институт образования